Больш Беларусі ня жабрачкай ня гнуцца — сталёвай індустрыі шырся ўзьлёт



Ладзім, габлюем,
Шнуруем, пілуем,
Корпус за корпусам,
Фабрык і вузаў.
Будуем, будуем, будуем,
будуем
Вялікім Савецкім Саюзам.

ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 158 (1427) | СУБОТА, 11 ліпеня 1931 г.

А там,
Вартавы, як заведзены,
крочыць—
Вільня. Лукішкі.
ПЯРЭДНІ ПЛЯН.
Бушуе астрог і раве да
паўночы
Крывёю рабочых,
Крывёю сялян.

РАСЬЦЕ ПРЫМЕЖНАЯ КРАІНА— У РАЗЬБЕЖНАЙ БАРАЦЬБЕ

Мацаваць цытадэль

Працоўным Савецкай Беларусі, адрозьніць сваё сёньня ад мінулага ўчора, якое аддзяляецца ў гісторыі 11-ю гадамі—не складае асаблівае цяжкасьці. Нават ў той час, калі хоць на хвіліну забыць аб тых катаваньнях і зьдзеках, што мелі месца ў дні белапольскай акупацыі.

Капіталістыя, абшарнікі былой царскай Расіі, а за тым, белапольскія бандыты зграяй абжорлівых драпежнікаў, рабавалі працоўных Беларусі. Прымушалі рабочых працаваць па 15 гадзін за нікчэмную плату. Даводзілі да жабрацтва сялянства. Голад, патрэбы, пошасьці—не пакідалі працоўных. Іх ня лічылі за людзей. Яны былі прымушаны рабіць усё, што толькі спадабалася буржуазіі, выконваць усе яе капрызы. У школах навучацца прадстаўлялася магчымасьць, акрамя буржуазных дзяцей, прывілегаванаму шляхецтву. 70 проц. насельніцтва Беларусі было няпісьменным.

І гэты ганебны, капіталістычны лад, зьнішчаны кастрычнікам, белапольскія бандыты хацелі затрымаць на Беларусі далей. Акупаваўшы Беларусь яны зброяй і крывёю імкнуліся запужаць працоўных. Вось чаму, у адказ на гэта, комуністычная партыя паставіла пытаньне рубам:

„Быць, ці ня быць Савецкай Рэспубліцы Беларусі—гэтае балючае пытаньне вырашаецца на полі барацьбы ў рашаючых бойках".

Вось чаму кіруемы партыяй ленінскі комсамол, (аддаўшы ўсе лепшае, ў шэрагі Чырвонай арміі, а рэштка актыўна дзейнічаючая ў партызанскіх атрадах) заклікаў пролетарскую моладзь:—„ідзі туды, дзе сумленна змагаюцца і паміраюць твае старэйшыя браты, дзе за рэволюцыю, за вольнае шчасьлівае жыцьцё, льлецца кроў лепшых сыноў рабочых і сялян".

Залітая крывёю, ўсеяная чалавечымі касьцьмі, Беларусь—пажараў, вогнішчаў, дзякуючы мобілізацыі сіл і энэргіі працоўных. дзякуючы націску Чырвонай арміі пад кіраўніцтвам комуністычнае партыі вызваліла абшары Савецкай Беларусі ад акупантаў.

11 год з дню вызваленьня—запоўнены настойлівай і гэроічнай работай. За гэты час Беларусь—балот, лясоў, занядбалай сельскай гаспадаркі, зьмяніла свой твар. Яна ператвараецца ў краіну буйнай высока-разьвітай тэхнікі і гаспадаркі. Пабудаваны Асінстан, Магвалакнабуд і іншыя буйныя прадпрыемствы, дабудоўваюцца і будуць пушчаны у „3-м рашаючым" яшчэ новыя прадпрыемствы. Індустрыялізуецца, машынізуецца сельская гаспадарка. Організавана 30 МТС. Шпаркімі тэмпамі расьце колектывізацыя сельскае гаспадаркі. На першае ліпеня было колектывізавана 39,7 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак Беларусі. Расьце культурны ўзровень; паляпшаюцца ўмовы жыцьця працоўных. Да першага студзеня 1932 году Беларусь будзе зьяўляцца краінай закончанай суцэльнай пісьменнасьці, чым ня можа пахваліцца ніводная капіталістычная дзяржава.

Наша сёньня—шпаркія тэмпы соцыялістычнага будаўніцтва.

Становішча працоўных Заходняй Беларусі ў шмат разоў горш за тое становішча і ўмовы, у якіх працоўныя Беларусі знаходзіліся да Кастрычнікавай рэволюцыі. Тысячы, дзесяткі тысяч працоўных бяз працы і хлеба. Рэволюцыйных пролетараў буржуазія кідае ў турмы, робіць крывавыя расправы.

Вопыт рэволюцыйнай барацьбы і практыкі соцыялістычнага будаўніцтва ў Савецкай Беларусі пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі зьяўляецца лепшай зброяй рабочых Заходняй Беларусі супроць польскага фашызму, супроць нацыянальнага прыгнечаньня. Невыпадкова-ж фашысцкая Польшча шалёна рыхтуецца да ўзброенага нападу ў першую чаргу на Савец. Беларусь, з тым, каб сарваць нашае пасьпяховае соцыялістычнае будаўніцтва.

11-тую гадавіну вызваленьня,—пролетарыят Беларусі адзначае новай хваляй творчага ўздыму, адзначае ўпартай, настойлівай барацьбой на выкананьне задач 3-га рашаючага году пяцігодкі, узмацненьнем абараназдольнасьці краіны. Савецкая Беларусь — форпост СССР з капіталістычным сьветам павінна зьявіцца непрыступнай цытадэльлю для імпэрыялізму.

Чырвонаштандарны ленінскі комсамол узмацненьнем работ па вайсковаму выхаваньню павінен мацаваць гэтую цытадэль.

„Пушкі, пушкі грукаталі, трашчаў наш кулямёт"

„Дымам і пажарам пушчалі паны Беларусь". Языкамі полымя лізалі разьюшаныя атрады белапольскіх войск гарады і вёскі. Палілі ў разьюшанай злосьці, каб не дасталося пераможцам, тым, хто абадраны, бяз хлеба, гнаў іх у карак, хто быў зьнітаваны адзінай мэтай перамогі і таму ён пераног. Гналі насельніцтва грузіць вугаль, драўніну, раскідваць будынкі, каб не пакінуць „ім".

Палілі, рубнавалі, білі, гвалтавалі, адчуваючы, што гэта апошнія дні крывавага панаваньня.

Беларусь савецкай стала На руінах,

на раскіданай белапольскімі окупантамі ўбогай спадчыне царскага панаваньня пачала адбудоўвацца Беларусь. Новы гаспадар будаваў новую Савецкую Беларусь. Будавалі яшчэ з тымі сьпевамі, з якімі перамагалі, у абрыўках вайсковай адзежы, на пажарышчах з апаленых пажарам дошак. Братэрскія савецкія рэспублікі дапамагалі залечваць раны Савецкай Беларусі.

А далей ударнымі брыгадамі, цэхамі, вытворчымі мазгамі, ажыцьцяўляўшы ленінскую ідэю соцспаборніцтва—

пабудавалі

машына-будаўнічы завод—Гомсельмаш, з маленькіх майстэрняў імя Бурбіса новы завод „Комунар". Крычаўскі фосфарыты. Гарбарня „Бальшавік", які ў барацьбе стаў чырвонаштандарным. Завод імя Варашылава. Бабруйскі дрэваапрацоўчы комбінат.

Кліча дух бунтарскі ўперад.
Ідуць КПЗБ колёны
— Скора час! Над Бэльвэдэрам.
Загарыцца Сьцяг чырвоны.

Гудуць гудкі Грукочуць варштаты сьпевам перамог

А галоўнае, ва ўпартай барацьбе, нарадзіліся новыя людзі, сотні тысяч герояў, якія штодзённа—

будуюць, будуюць, будуюць, яны сёньня камандзіры будоўлі, яны сёньня творцы перамог.

Так кажуць лічбы

У 1913 годзе на Беларусі эксплёатавалася 22 тысячы рабочых, у 1922-23 годзе, праз два гады пасьля панаваньня белапалякаў, у разьбітых карпусах, ля разрабаваных варштатаў адбудоўвалі сваю Савецкую Беларусь 10807 рабочых, сёньня будуюць, парамагаюць 87 тысяч рабочых, з якіх большасьць ва ўдарных брыгадах.

У нас сёньня няма беспрацоўя. А там:

„Маладыя дзяўчыны,—піша фашысцкая газэта „Слова",—якія прыяжджаюць у гарады шукаць працу і застаюцца бяз усякіх сродкаў да існаваньня, становяцца ахвярай розных эксплёататараў, а часта гандляроў жывым таварам".

Кошт валавай продукцыі прамысловасьці у 1923 годзе складаў 99968 тысяч рублёў. У 1922-23 годзе—28587 тысяч рублёў. У 1931 годзе 754 мільёны рублёў.

На аснове гэтых перамог, набытых упартай працай, мы зараз дасягаем яшчэ больш.

Будуюцца дзесяткі новых заводаў. Цэмэнтны завод у Крычаве. Цагляны завод у Сяглове (Аршанскі раён) Гомельскі шкляны завод. Сканчаем пабудову Аршанскага ільнакомбінату. Пашыраем будаўніцтва Гомсельмашу.

У трэцім квартале „3-га рашаючага", увойдзе ў строй новы корпус Менскай абутковай, новы цэх „Комунару", Віцебскі панчошна-трыкатажны комбінат і яшчэ і яшчэ...


Торпапрамысловасьць,

якая зараз магутна разгарнулася зьявіцца базай электрыфікацыі прамысловасьці Савецкай Беларусі,—фактычна на Беларусі ня існавала.

У гэтым годзе торпазаводы Беларусі дадуць 740 тысяч тон торпу, у 1932 годзе, каб забясьпечыць выкананьне пляну вялікай будоўлі яны дадуць 1500 тысяч тон.

„Там" ідзе змаганьне

„Брук, месца куды капіталізм у абцугох крызісу вывідае сотні і тысячы людзей, ужо перастае належыць фашыстым, Пролетарыят выходзіць на вуліцы. Дэманстрацыі ўсё часьцей ды часьцей парушаюць „спакой" фашыстых і іхных служак. І для захаваньня супакою ўзброіваецца паліцыя, уводзяцца замежныя „панівікі", „газавыя бомбы, бронявікі". А. С-л





Стварaем нацыянальную па форме пролетарскую па зьместу

Сёньня рабочыя і калгасьнікі, бедныя і серадняки-сяляне сьвяткуюць 11 гадавіну свайго вызваленьня ад панцужных сабак імпэрыялізму—польскіх паноў.

Працоўныя масы Беларусі пры братэрскай дапамозе рабочай клясы усяго Савецкага Саюзу аднавілі зруйнаваную імпэрыялістычнай і грамадзянскай войнамі гаспадарку і прыступілі да рэканструкцыі усяе народнай гаспадаркі і правядзеньня культурнай рэволюцыі.

Дасягненьні, якія будзем ілюстраваць пікай фактамі у галіне культурнага будаўніцтва, рабочай клясай здабыты пад кіраўніцтвам КП(б)Б у жорсткай і упартай барацьбе з контррэволюцыйным беларускім нацыянал-дэмакратызмам, і яго носьбітамі. Нацдэмы, захапіўшы культурныя вышыні (акадэмію, НКА, Выдавецтва, некаторыя органы друку) імкнуліся атакаваць ленінскую палітыку ЦК КП(б)Б, накіроўваючы сваю контррэволюцыйную дзейнасьць на пераўтварэньне БССР у фашысцкую дзяржаву—апору польскага імпэрыялізму.

Якраз сёньня першай вышэйшай навучальнай школе на Беларусі-Беларускаму Дзяржаўнаму універсытэту рабочая кляса Беларусі запісвае у свой паслужны сьпіс дзесяць год існаваньня, дзесяць год змаганьня за пролетарскія кадры, за культуру, нацыянальную па форме, пролетарскую па зьместу. Толькі адзін універсытэт за гады свайго існаваньня выпусьціў з сваіх муроў 3020 чал. спэцыялістаў па розных галінах нашага будаўніцтва.

У гэтым годзе БССР налічвае 12 вышэйшых кузьняў пролетарскай навукі, тэхнікі і мастацтва на чале з Беларускай Акадэміяй Навук (у некаторых з іх маюцца нацыянальныя сэктары, напрыклад у БДУ польская і яўрэйская).

Колькасьць студэнтаў у вышэйшых школах, апроч асьпірантуры БАН, на сёньняшні дзень, больш, як 10 тысяч чалавек.

На абшарах Савецкай Беларусі раскінута шмат школ розных тыпаў, розных ступеняй і шмат з іх на мовах нацыянальных меншасьцяй. Возьмем сярэдні тып школы.

У гэтым годзе працавала тэхнікумаў розных спэцыяльнасьцяй—65 з лікам студэнтаў 11,500; рабфакаў—24 з 6-ю з пал. тысяч студэнтаў.

З колькасным ростам навучальных установ палепшылася і якасьць прадукцыі выпускаемай імі. З колькасным ростам студэнтаў палепшыўся і соцыяльны склад студэнтаў.

	1926-27	1929-30
Вышэйшыя навучальныя ўстановы:		
Рабочых	14,6 проц.	41,8 проц.
Сялян	49,9	36,2
Тэхнікумы:		
Рабочых	14,8 проц.	31,2 проц.
Сялян	49,6	50,2
Рабфакі:		
Рабочых	41,7 проц.	82,2 проц.
Сялян	58,3	15,3

Нацыянальны склад студэнцтва, асьпірантуры, па даных БДУ, мае прыблізна наступны выгляд: беларусаў каля 60 проц., яўрэяў—30 проц. і інш. 10 проц.

Усе навучальныя ўстановы, пачынаючы ад пачатковых і канчаючы БАН, беларусізаваны. Студэнцтва і асноўныя масы навуковых працаўнікоў з посьпехам аўладалі беларускай мовай, гісторыяй і г. д.

На народную асьвету на БССР (па ўсіх ведамствах) трацілася 31.694.9 тыс. руб., гэта 18,25 проц. к агульнаму дзяржаўнаму бюджэту. А колькі на мясцовым?..

Каб мець уяўленьне, які крок зрабіла наша краіна наперад, паказвае наступнае: да рэволюцыі было 70 пр. непісьменнага насельніцтва, а ў апошнім годзе пяцігодкі—(1932 год) БССР будзе краінай суцэльнай пісьменнасьці. Уведзенае ў 1929 годзе ўсеагульнае навучаньне, з посьпехам рэалізуецца.

У дасягненьні посьпехаў на ўсеагульным навучаньні і лікбезу камсамол адыграў і адыгрывае вялікую ролю.

Карацей кажучы, па ўсіх звеньнях навучальных установ за партай сядзіць паўтары мільёны чалавек (30 проц. усяго насельніцтва Беларусі).

Толькі ва ўмовах дыктатуры пролетарыяту можна ўзьняць масы на культурны паход за аўладаньне навукай і мастацтвам.

БССР налічвае шмат дзяржаўных прафсаюзных і іншых арганізацый і тэатраў на беларускай, яўрэйскай, польскай мовах, студыю опэры і балета і шэраг музычных і мастацкіх установ. Значна пашырылася сетка кіно-тэатраў, клюбаў, хат-чытален і г. д.

Паказваць лічбы дзіцячых ясьляў, садоў, пляцовак, сталовак мэдычных установ як у горадзе, так і ў вёсцы лічым непатрэбным, бо іх кожны, хто мае вочы, бачыць на кожным кроку.

Усім вядомы забудаваньні па апошняму слову тэхнікі і новы Універсітэцкі гарадок, клінікі, заканчваецца будоўля Дзяржбібліотэкі і г. д. Таксама вядомы выпуск і тыраж газэт, часопісаў і кніг на мовах беларускай і нацменшасьцяў.

Праў Максім Горкі, калі ён кажа, што мы недацэньваем сваіх дасягненьняў. Калі вы, чытач, хочаце уявіць нашы посьпехі, адчуйце вобраз дарэволюцыйнай Беларусі, а яшчэ лепш—сучаснай Заходняй Беларусі,—там усеагульны крызыс капіталістычнай сыстэмы, паўпэрызацыя насельніцтва і дзікасьць працоўных мас тут, у нас нябываны эканомічны росквіт ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі, палепшаньне эканомічнага дабрабыту рабочых і калгасьнікаў, узрост іх культурных запатрабаваньняў і іх задавальненьне.

Дасягнуць далейшых посьпехаў эканомічнага і культурнага будаўніцтва магчыма толькі пад кіраўніцтвам КП(б)Б, разгортваючы барацьбу на два фронты—з правым опортунізмам і шовінізмам і выкрываючы і дабіваючы рэшткі контррэволюцыйнага беларускага нацдэмократызму і шовінізму рознай афарбоўкі, рэалізуючы з посьпехам лёзунг рашаючага году, якая будзе новы уклад для „1040“, „518“ а разам з імі узьняць на вышэйшую ступень культуру—нацыянальную па форме і пролетарскую па зьместу.

С. Вязін.

Па тэлеграфу з чырвонай сталіцы сусьвету

Менск, Наркамасьветы

Прашу вас прыняць, а таксама перадаць студэнтам і профсаюзска-выкладчыцкаму складу мае сардэчныя віншаваньні з повадку сьвята 10-годзьдзя універсытэту. Няхай жыве БДУ—палкі ачаг пролетарскай рэволюцыйнай культуры, узьняты савецкай уладай з самай нізы двух сьветаў, бясьсільна аджываючага і новага, поўнага сіл і надзей.

Няхай жыве вялікая будучыня соцыялістычнай навукі і тэхнікі і яе радасная ўдзелу ў будаўніцтве новае грамады.

Профэсар Бэркенгэйм.

Зьмітрок Астапенка

Да адзінаццатага ліпеня

Як сонца ў жнівеньскую даль,—
У паходны шэраг песьні сталі...
Чым больш гартуецца мэталь,
Тым сіла большая ў мэталі.
Сягоньня весткі тэлеграф
Прынёс ляскотаю сухотнай—
Ізноў пра гвалты чорных граф
Над акрываўленай Заходняй.
Я са знаёмаю тугой
Праслухаў стогн жывога краю.
А добрага ўжо колькі год
Я з таго боку не чакаю,
Ізноў—звычайны боль і жаль,
І роспач зноў у дзікім шале...
...Як сонца ў жнівеньскую даль,
У паходны шэраг песьні сталі.

Пачынаецца песень паход.
Адчынюць

20-ты год

Сонца ўстрывожылася
Пыл,
Пад,
Страх
Зямлю варожую
Угрыў
Зала...
—А-ах!
Над кавалерыяй
Пік—
— Рук
Ціх.
Угору ўзрэзалі
Крык
Мук,
Енк.
Вуліцы, плошчы !
Брук,
Рык,
Крок...
Цепь.
Дымам узрошчаны
Грук,
Крык.
Кроў...
А за туманам смутным
Полымя зор пацікутных.
Гэта на Менскіх накоднах
Мчыцца чырвоная коньніца.
Мчыцца, мчыцца, мчыцца...
—Беларусь ад паноў будзе чыста!..
—Бо-ж за тайгі за брытанскіх мараў
Армія чырвоная ўсіх нацый...
—Гэй!.. гэй!.. гэй!..
—Зброі чырвонай слава!..
—Даёш Варшаву!..

Пачынаецца песень паход
Па старонках наступных год.
І боль варожай сталі
Мы, гордыя, спазналі.
І кроў, і дым баталій
Мы, моцныя, спазналі.
І бег у дзікім шале
Мы, буйныя, спазналі,
І перамогі звон
Нас мчаў, абмываў...
А вызваліўся край
Ад кліччу чорных зграй—
І крыкнуў—узьнімай!..
Сказаў нам—Узьнімай!
Вышэй за кожны край!..

У палёх паржавелі драты.
Мы забыліся пра фраты.
Пераплаўлены цэлы гармат
І сказаў пехацінец:
— Брат,
Мы не вернемся ўжо назад!
Змацавалі крыві мы край,
Я да плугу іду... Бывай!

Вам, сыны пакаленьняў наступных,
Раскажуць пра тысячы ўпартых і
рунных!..
Як праз нэпаўскія часы
Правялі мы сваю краіну,
Як пламеням мы ўсе штогод
Свой разгортвалі ўдаль паход—
Паход—
за кожны новы завод!
Паход—
на недаход!
Паход—
на кулацкі завод!
Паход... Паход...
Паход...
Як спадчыну сабе—ня зналі,
Як КСМ, сваю узьнімалі,
Як узьнялі яе зычным гудам
Ад Палесься да Дняпрабуду.
Ад Палесься да вод Пячорскіх
Па Кузбасах, Магнітагорсках
Заварылі такую кашу,
Што ў песьнях не перакажаш...

Як сонца ў жнівеньскую даль,—
У паходны шэраг песьні сталі...
Чым больш гартуецца мэталь,
Тым сіла большая ў мэталі.
Сягоньня весткі тэлеграф
Прастукаў ляскатам сухотным
Ізноў пра гвалты чорных граф
Пра бліскавіцы над мяжой.
Пра хціцы сьвіст варожых ветраў
Вартуй, таварыш!.. Моцна стой!..
Вартуй Рэспубліку Саветаў!..
А мы—запомнім гэта усё—
І чорны зьдзек, і гвалт няспынны,
І ціск варожых паясоў
На целе збэшчанай краіны.
Мы пэўна плавім нашу сталь,
Гартуем душы гартам сталі...
...Чым больш гартуецца мэталь,
Тым сіла большая ў мэталі.

Барыс Мікуліч

КРЫВЯНАЯ СЫЦЬ

Аповесьць „Наша сонца“, над напісаньнем якой шэфствуе „ЧЗ“, урыўкі з якой друкуюцца ніжэй, прысьвечана комсамолу. Першая частка гэтай аповесьці („Кірункі вятроў“) малюе разбурэньне інтэлігенцкай сям'і ў часе рэволюцыі, грамадзянскую вайну.

У Менску адбываўся „беларускі конгрэс“.

На яго зьехаліся так званыя прадстаўнікі ад рабочых і сялян: члены беларускіх нацыянальных партый, дэлегаты розных нацыянальных камітэтаў, што былі ў Расіі, а беларускае сялянства—сялянства якое стагодзьдзямі стагнала пад бярэмам нацыянальнага і соцыяльнага ўціску, якое сьпіну гнула на неўраллівых палетках, якое песьні складала, і пелася ў гэтых песьнях пра бяду: бяда спаць ня хоча, селянін ідзе шукаць долі-волі сярод людзей, прыходзіць, змардаваны і зьнясілены дахаты і гэтая бяда апчэрваецца зноў на яго: „Дзе гуляў, няцнота“,—а беларускае працоўнае сялянства замянілі прадстаўнікі... земскіх камітэтаў (даніна Керанскаму).

Заля, дзе засядаў конгрэс, купалася ў белых сьцягах і гэта было дужа-ж дзіўным: дзьве-ж навальніцы адгрымелі ў былой царскай Расіі, дзьве-ж адгрымелі навальніцы гэтай першай вясной Расійскай рэволюцыі.

І на адным з паседжаньняў раздаўся голас:

— Я прапаную замяніць белыя сьцягі чырвонымі!

Калі раздаўся ў залі гэты голас тады адбылося тое, што запісана ў летапісах „бацькаўшчыны“. Генэрал Кандратовіч—ён быў у прэзыдыуме конгрэсу—узьняўся з месца, бліснулі вочы бляскам гузікаў генэралавага мундзіру, ён падышоў да белага сьцягу і, схіліўшы галаву, пацалаваў гэты кавалак белае крамніны. Заля захлынулася воплескамі: аплёдыравалі пярэднія шэрагі—гонар „бацькаўшчыны“—а за пяреднімі шэрагамі аплёдыравала і большасьць дэлегатаў.

— Няхай жыве рада, няхай жыве вольная бацькаўшчына—крыкнуў профэсар Шастакоў.

Профэсара качалі, і сьмешна цяпаліся ў паветры фалды ягонага фраку.

Праходзілі дні. Абласны выканаўчы камітэт прыслаў у залю паседжаньня конгрэсу сваіх дэлегатаў.

Заля шумела. Толькі жменька дэлегатаў—гонар! „бацькаўшчыны“, слухалі профэсара Шастакова. Дзьверы расчыніліся з грукатам. Жменька дэлегатаў павярнулася, каб паглядзець на прышоўшых, павярнулася з нейкай захаванай надзеяй, што вярнуліся дэлегацыі, якія неразумна пакінулі конгрэс (частка дэлегатаў праз меру разумна зьбіла прадстаўніка віцебскага сялянскага зьезду, які прачытаў дэклярацыю аб адкліканьні віцебскіх дэлегатаў-сялян), павярнулася і ўбачыла незнаёмых людзей. Іх было ня шмат. Яны былі ўзброены. Наперадзе гэтай няпрошанай дэлегацыі ішоў чалавек у пашарпанай тужурцы. Чалавек проста прашоў на трыбуну і адказаў на немае запытаньне прысутных:

— Імем абласнога выканаўчага камітэту конгрэс распускаецца. Камітэт прапануе зараз-жа закрыць паседжаньне.

Сказаў чалавек і ледзь-ледзь усьміхнуўся: усьмешку стрымаць было цяжка—мізэрны быў гонар! „бацькаўшчыны“.

Профэсар Шастакоў—рукі застылі ў паветры—сказаў ціха:

— Прыдзецца адклясьці паседжаньне на...

Ён ня скончыў, пашоў з трыбуны, і сьмешна цяпаліся ў паветры фалды ягонага фраку.

Гэтае „на“ прагучэла праз пяць год у Вэраіне, каб больш ніколі ня гучэць.

* * *

На краіне вялі вятры. І тады—у гэтыя гады (дзевятнаццаты і дваццаты) людзі забыліся на навукі, на мэтэрыолёгію: вецер веяў у невядомых кірунках, непазнаных яшчэ дагэтуль, і пад гэтым ветрам зьмяняліся абрысы зямлі (закон аб рацыяналізацыі сусьвету зьмяніўся раптоўна!): старамодны пакрой хмар нявечным быў—былі новыя хмары—дымавыя заслоны,—нявечнай была і зямля—яна цьвіла—цьвіла, хоць і не малахітамі, а рубінамі і караламі: рубінамі і караламі XX стагодзьдзя: выбухамі, крывёю, агнём з гарматных жэрлаў.

Цяжка было зразумець—дый гэтага ў тыя гады (дзевятнаццаты і дваццаты) ніхто і няважыўся зразумець—цяжка было зразумець, дзе нараджаўся вецер, і раз нарадзіўшыся, куды трымаў ён кірунак. Адно толькі лёгка было зразумець: усе вятры былі аднальковыя: і з поўначы, і з поўню, і з захаду, і з усходу прыносілі гэтыя вятры адно і тое-ж—выбухі, кроў, агонь з гарматных жэрлаў.

Вятры нараджаліся раптоўна: каля любога мястэчка, каля любога гораду. І гэтак-жа раптоўна нараджаліся на парканах местачковых і гарадзкіх вуліц плякаты. Крычаў з плякату чалавек—стандарт чалавека: „Стой! Ты записался добровольцем?“. І як вятры раптоўна нарадзіліся, узьнікаў голад—і ён (голад) ня меў адмысловых кірункаў, быў голад была: сыць. Сыць пачыналася пры пачатках эвакуацыі: разьбівалі склады, рассыпалі на бруку—(па гразі) муку і соль,—гэта сыць была зьвярынай, вокамгненнай і—з гэтай прычыны, з гэтых двух прычын—хімернай. І была яшчэ сыць, сыць другога гатунку—сыць крыві...

На парканах местачковых і гарадзкіх вуліц крычаў з плякатаў чалавек—стандарт чалавека: „Стой! Ты записался добровольцем?“. І людзі (людзі, а не стандарты) ішлі па вёсках, па сёлах, па паселішчах, па мястэчках і гарадох аддаваць свой розум, сваё цела рэволюцыі, ішлі людзі рабіць рэволюцыю, бараніць рэволюцыю, паміраць за рэволюцыю (—праз дзесяцігодзьдзі хай помняць герояў: ім слава!), перамагаць імем гэтай рэволюцыі, бо людзі-ж гэтыя створаны былі—а сказаць больш выразна: набылі сваё бытаваньне—рэволюцыяй!

Было ім: восемнаццаць, дзевятнаццаць, дваццаць. Быў ён: камітэт КСМ (райком, паветком, валком). І была мобілізацыя комсамольцаў:

— На фронт, таварышы! Вырваць краіну з кіпцюроў драпежнага белага арла.

І была вайна за творчую ідэю станаўленьня соцыялістычнага грамадзтва, і тысячы юнакоў паміралі за права жыць і сьпяваць, за права ствараць тое, што захаванай энэргіяй сьпела стагодзьдзямі.

Тысячы юнакоў паміралі, памерлі—праз тысячагодзьдзі хай помняць герояў: гэтымі радкамі пяю ім славу!

Колгаснай навіною заквітнелі беларускія палі

У 1932 годзе БССР скончыць у асноўным суцэльную колектывізацыю і на яе аснове ліквідуе апошні аплот капіталізму ў вёсцы—кулацтва як клясу

З адозвы ЦВК БССР

ДА 11-ГОДЗЬДЗЯ ВЫЗВАЛЕНЬНЯ БЕЛАРУСІ АД БЕЛАПАЛЯКАЎ

Народжаная ў агні Кастрычніцкай рэволюцыі, Савецкая ўлада на аснове ленінскай нацпалітыкі, вырашыла нацыянальнае пытаньне, даўшы поўную магчымасьць працоўным усіх нацыянальнасьцей, прыгнечаным у мінулым будаваць сваю соцыялістычную дзяржаву.

У перыод геройчнай барацьбы краіны пролетарскай дыктатуры белапольскія банды, пры актыўнай дапамозе міжнароднага імпэрыялізму, пад сьцягам вызваленьня „культуры" і „цывілізацыі" акупавалі Савецкую Соцыялістычную Беларусь.

Мы атрымалі ў спадчыну ад акупантаў руіны гарадоў, мястэчак і вёсак, тысячы інвалідаў, вогнішча зруйнаваных вёсак і фабрык.

Абапіраючыся на геройчную дапамогу усяго Савецкага Саюзу, рабочая кляса і ўсе працоўныя пад кіраўніцтвам партыі бальшавікоў з вялізарным энтузіязмам, з вялізарным геройзмам пачалі аднаўляць вызваленую Савецкую Соцыялістычную Беларусь. Суседнія імпэрыялістычныя драпежнікі не шкадавалі сіл, каб сарваць мірнае будаўніцтва БССР. На тэрыторыю Савецкай Беларусі былі кінуты дыверсійныя банды, якія імкнуліся праводзіць далей крывавую контр-рэволюцыйную справу белапольскіх акупантаў.

Цяжкая спадчына пакінутая белапольскімі окупантамі, была ліквідавана геройчнымі намаганьнямі усёй рабочай клясы і працоўных усіх нацыянальнасьцей пры дапамозе Савецкага Саюзу, пад бальшавіцкім кіраўніцтвам партыі Леніна. Дзякуючы найвялікшай дапамозе Саюзу Савецкіх Соцыялістычных Рэспублік БССР, вызваленая ад ушчэнту белапольскіх окупантаў, стала на шлях пераможнага соцыялістычнага будаўніцтва. Разгортваючы соцыялістычнае будаўніцтва пад кіраўніцтвам КП(б)Б і яе Цэнтральнага Камітэту БССР ператварылася з адсталай, прыгнечанай паўкаленіяльнай політыкай царызму у рэспубліке індустрыяльных гігантаў, магутных электрастанцый, буйных саўгасаў, колгасаў і машына-трактарных станцый.

У БССР, як ва усім Савецкім Саюзе зьліквідавана беспрацоўе.

Гіганцкімі тэмпамі расьце творчы ўздым і працоўны энтузіязм шырокіх мас рабочых, колгаснікаў і асобных бядняцка-серадняцкіх мас. З посьпехам ажыцьцяўляецца пяцігодка ў чатыры гады. Передавыя раёны БССР завяршаюць у асноўным суцэльную колектывізацыю і на яе аснове ліквідацыю кулацтва як клясы,—гэтай апошняй апоры міжнароднай контррэволюцыі.

Гістарычныя перамогі соцыялістычнага будаўніцтва у БССР здолелі дасягнуць у разбуранай белапольскімі окупантамі краіне, толькі пры дыктатуры пролетарыяту і пад сталёвым ленінскім кіраўніцтвам комуністычнай партыі.

Да 11-годзьдзя вызваленьня БССР, мы дасягнулі такіх тэмпаў індустрыялізацыі—гэтай адзінай базы соцыялізму (Ленін), якія не ведае ні адна капіталістычная краіна. На аснове бальшавіцкіх тэмпаў індустрыялізацыі і няўхільным уздымам усёй народнай гаспадаркі з году ў год узрастае матар'яльнае і культурнае становішча рабочае клясы і ўсіх працоўных.

На аснове індустрыялізацыі мы дасягнулі гістарычных перамог у справе соцыялістычнай рэконструкцыі вёскі.

Няўхільна расьце культурны і нацыянальны уздым працоўных нацыянальных меншасьцей. Пад кіраўніцтвам партыі працоўныя усіх нацыянальнасьцей будуюць нацыянальную культуру па форме, соцыялістычную па змесьце.

БССР ператвараецца у краіну суцэльнай пісьменнасьці.

Пад кіраўніцтвам комуністычнае партыі рабочая кляса і працоўныя ўсіх нацыянальнасьцей пры братэрскай дапамозе усяго Савецкага Саюзу яшчэ больш узмоцняць абароназдольнасьць нашай краіны і з посьпехам завяршаць пабудову фундаманту соцыялістычнай экономікі.

— Няхай жыве ленінская партыя бальшавікоў і яе правадыр т. Сталін!

— Няхай жыве пролетарская дыктатура!

Ч. в. аб. Старшыні ЦВК БССР М. ГНІЛЯКЕВІЧ.

За сакратара ЦВК БССР Б. ВАНСОЎСКІ.

На руінах мінулага вырасьлі фабрыкі мяса і тэхнічных культур

За 11 год ударнай соцыялістычнай будоўлі Савецкая Беларусь дасягнула вялізарнейшых посьпехаў у галіне саўгаснага і колгаснага будаўніцтва.

На сотнях тысяч га вырасьлі буйныя савецкія гаспадаркі масла, малака, тэхнічных культур і хлеба. У 1928 годзе удзельная вага саўгасаў вымяралася 40 тысячамі га пасеваў, а ў 1931 годзе пасеўплошча саўгасаў дасягнула 110500 га пры агульнай плошчы саўгасаў 300 тысяч га. Толькі за 4 гады пасеўная плошча па саўгасах узрасла у 3 разы.

176 мільёнаў руб. грашовых укладаньняў намечаны для сельскай гаспадаркі ў 1931 годзе.



Тав. Сьцяпаніда—прымяраная ўдарн ца саўгасу „Кухчыцы".

На будаўніцтва жывёлагадоўчых фабрык саўгасаў, намечана укласьці 2014 тысяч руб. Толькі у спецыялізаваных саўгасах колькасьць буйнай рагатай жывёлы дасягнула 26187 галоў, якіх да канца 1931 году будзе 4.. тысяч. Вялікія грашовыя укладаньні асыгнаваны на будаўніцтва сьвінаводных саўгасаў.

На саўгасах „Сьвінаводу" пастаўлена 25 тысяч сьвінаматак, гурт якіх у 1932 г. дасягне 75 тысяч. Зараз агульнае пагалоўе сьвіней па саўгасах „Сьвінаводу" даведзена да 16400 штук, а да першага студзеня 1932 году яно ўзрасьце да 215 тысч. Сьвінагадоўчыя саўгасы ўжо сёлета дадуць 60 тысяч таварных сьвіней.

„Наша краіна стала краінай самай буйнай сельскай гаспадаркі ў сьвеце".

Няўхільна ажыцьцяўляючы лінію партыі, па колектывізацыі Савецкая Беларусь, у галіне колектывізацыі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, дасягнула вялізарных посьпехаў, 41 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак сталі на шлях колектывізацыі.

Пасеўная плошча па рэспубліцы супроць мінулага году пашырана на 7 проц. Плошча пасеву лёну, якая, вызначана для БССР у 240 тысяч га значна перавыканана. Спецыялізацыя сельскай гаспадаркі прынесла сур'ёзныя перамогі. Удзельная вага пасеўплошчы тэхнічных культур у ільнаводных раёнах дасягнула 33,3 проц. да агульнай пасеўплошчы.

Гэтыя, далёка не поўныя лічбы аб саўгасным і колгасным будаўніцтве, кажуць аб тым вялікім геройзме, які праяўлены рабочай клясай і працоўнымі масамі Савецкай Беларусі, за соцрэконструкцыю с-г. Савецкая Беларусь ператвараецца з краіны адсталай нацыянальна прыгнечанай, у саўгасна-колгасную Беларусь—шырока разгорнутай індустрыі.

11-ю гадавіну вызваленьня Беларусі ад белапалякаў мы сустракаем грандыёзнымі перамогамі на соцыялістычнай рэконструкцыі сельскай гаспадаркі, якія дасягнуты намі на аснове ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі ў няўхільнай барацьбе з кулацтвам, шкоднікамі, правымі і „левымі" опортуністамі.

Нашы бліжэйшыя задачы—паударнаму правесьці ўборачную і асеньнюю пасяўную кампаніі, на-ўдарнаму прыбраць пасеўнае.

М.

МТС—магутны вагар колектывізацыі

Вялізарнейшых посьпехаў дасягнула Савецкая Беларусь на фронце машынізацыі сельскіх гаспадарак. 30 МТС Беларусі, якія маюць 924 трактары, закончылі вясеньнюю сяўбу з перавыкананьнем праграмы. Замест 203.390 га ініі засеяна 220 тысяч га, ці 108 проц. выкананьня пляну.

Перавыканаць план пасеву тэхнічных культур, якія ва ўмовах Беларусі зьяўляюцца адной з вядучых галін сельскае гаспадаркі. Лёну і каноплі МТС засеяна 41.914 га, замест вызначаных 37387 га, што складае 112,2 проц. пляну.

Вялікую ролю адыграла МТС у справе колектывізацыі сельскай гаспадаркі. Пры агульнай колектывізацыі БССР на 41 проц. у раёнах дзейнасьці МТС колектывізавана 44 проц. Маюцца раёны МТС, дзе колектывізацыя ў асноўным скончана, да якіх адносяцца—Койданаўскі—91,1 проц. Лепельскі—81,1 проц., Хоцімскі—75,8 проц. і г. д.

Шырока разгортваючы соцыялістычныя формы і мэтоды працы МТС па ўдарнаму падрыхтавалася да правядзенчя ўборачнай кампаніі.

Б.

Ч. Хацкевіч

11 ліпеня

Для Беларускай Савецкай Соцыялістычнай Рэспублікі „Адзінаццатае ліпеня" зьяўляецца важнейшай гістарычнай датай. У гэты дзень 11 год таму назад сталіца Беларусі—Менск—была вызвалена Чырвонай арміяй і партызанскім рухам ад белапольскай акупацыі. З вызваленьнем ад белапольскай акупацыі для Менску, а затым і большай часткі Савецкай Беларусі, для нас адчынілася новая сьветлая старонка мірнага, соцыялістычнага будаўніцтва, работы па карэннай соцыялістычнай перабудове краіны.

За гэтыя 11 год пад геніяльным кіраўніцтвам Ленінскай Комуністычнай Партыі, мы маем вялізарнейшыя дасягненьні ва ўсіх галінах будаўніцтва соцыялізму ў нашай краіне. Дзеля таго, каб было зразумелым, як БССР пасьля белапольскай акупацыі ўзьнялася з попелу і руін і ідзе па шляху соцыялістычнага будаўніцтва прывядзем некалькі гістарычных фактаў.

У поўнай адпаведнасьці з рашэньнем першага Зьезду Комуністычнай Партыі (Бальшавікоў) Беларусі, 1-га студзеня 1919 г. часовы рабоча-сялянскі ўрад Беларусі аб'явасьціў Беларусь незалежнай соцыялістычнай савецкай рэспублікай. Скончылася нямецкая окупацыя, якая адбылася з пачатку 1918 г. пасьля чаго ўтварылася магчымасьць мірнага савецкага будаўніцтва. Аднак у хуткім часе ўсьлед за нямецкай акупацыяй, белагвардзейская Польшча з дапамогаю і пад кіраўніцтвам французскага і ангельскага капіталізму напала на краіну саветаў. Белая Польшча вызначыла для сябе межы 1772 г., гэта значыць, па Дняпру да Смаленску. Такім чынам белая Польшча зьявілася разам з гэтым і зброяй у руках усяго капіталістычнага сьвету, у барацьбе супроць дыктатуры пролетарыяту, супроць Кастрычніцкай рэволюцыі разам з іншымі белагвардзейскімі генэраламі, якія ў той час з дапамогаю розных капіталістычных дзяржаў вялі свае банды на краіну Саветаў—на пролетарскія цэнтры. 25-га студзеня 1919 г. маршал Фош патрабаваў ад пераможанай Нямеччыны вольнага пропуску праз мясцовасьці, (якія былі яшчэ заняты нямецкай арміяй польскіх войск для барацьбы з Савецкай рэспублікай.

Заняўшы 8-га жніўня 1919 г. Менск, а ўсьлед за гэтым і большую частку тэрыторыі Беларусі, Пілсудзкі у сваёй адозьве аб'яцаў насельніцтву Беларусі „зямлю і волю". У канцы гэта-ж жніўня белапалякі у сваім „абвяшчэньні № 16" расшыфроўваюць гэтую „волю". „Усялякая прыватная ўласнасьць, ці то захопленая гвалтоўным шляхам, або папаўшая выпадкова павінна быць безадкладна зьвернута ўласьнікам. Уласьнікі зямельнай маёмасьці ці іх правамоцныя намесьнікі абавязваюцца да 10-га верасьня прыняць у сваё ўладаньне зямельную маёмасьць.

Зразумела—абшарнікі, капіталістыя, фабрыканты з дапамогаю плёткі і штыка польскіх легіянэраў сталі сьпяшацца „прыняць у сваё ўладаньне". Пачаліся бязьлітасныя расправы з рабочымі і сялянамі. Буржуазія разам з белапольскімі окупантамі, пры дапамозе белапольскіх жандароў і легіянэраў, аднаўляла правы абшарнікаў і капіталістых. Турмы пачалі запаўняцца рабочымі, гарадзкой і вясковай беднатой. Вобыскі, арышты, растрэлы, асабліва сем'яў, члены якіх былі ў Чырвонай арміі, рабункі, падпалы, гвалты, пагалоўнае зьбіваньне паасобных вёсак—усё гэта тое, што складала „волю" пілсудчыкаў у дзеяньні на справе. Над прыгнечанай краінай панаваў лёзунг „Двадзесьці пеньць". Маладыя беларускія, яўрэйскія школы зачыняліся, рускія паланіліся. У горадзе пролетарыят перажываў беспрацоўе, голад, холад, прасьледваньне. У вёсках сельская бедната, батракі маёнткаў, якія засталіся ад арыштаў пакутвалі пад непасільлем розных падаткаў, зьдзекаў, гвалтоў і беспрацоўя. Усялякая праява нездавальненьня заўсёды выклікала цяжкія рэпрэсіі ў адносінах да працоўнага насельніцтва.

Нездаволеных белапольскім рэжымам вышуквалі, падазроных у прыналежнасьці да комуністычнай партыі растрэльвалі.

Асабліва цяжка пры белапольскай окупацыі жылося працоўным яўрэям. Ізноў пачаліся пагромы, якія ўжо былі пахаваны разам з царскім рэжымам.

Аднак, цярпеньню працоўных мас Беларусі ад нявыноснага прыгнечаньня белапалякамі прыходзіць канец. Пролетарыят, батракі і вясковая і мястэчковая бедната, пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі пачалі згуртоўваць свае сілы і накіроўваць іх супроць белапольскіх окупантаў.

Разам з комуністычнай партыяй і пад яе кіраўніцтвам разгортвае сваю работу і комсамол. Комуністычная партыя ад агітацыі і пропаганды шпарка пераходзіць да падрыхтоўкі паўстаньня супроць белапольскага прыгнечаньня. Працоўныя масы пераканаліся ў тым, што з іх цяжкага нявыноснага становішча маецца толькі адзін выхад—шлях паўстаньня, шлях узброенай барацьбы супроць белапольскіх банд. Лясы Беларусі сталі напаўняцца актыўна дзейнічаючымі чырвонымі партызанамі. Шмат загінула забітымі і расстралянымі лепшых сыноў Беларусі ў няроўнай пакуль-што, барацьбе з окупантамі, але гэтая, часам непасільная барацьба, прыносіла вялізарныя страты і белапалякам асабліва ў тылу.

Чырвонымі партызанамі Беларусі зьнішчаліся цэлыя атрады ворагаў, адбіраліся абозы, захопліваліся стрэльбы, кулямёты, гранаты. Расстрэлы менскіх, бабруйскіх рабочых, мазырскіх, дукорскіх, барысаўскіх партызан узьнялі самыя шырокія пласты на паўстаньне.

З вясны 1920 г. пачалося пераможнае наступленьне Чырвонай арміі, якая да гэтага часу зьліквідавала шматлікія фронты розных белых генэралаў. Ужо ў канцы мая белапалякі пад націскам Чырвонай арміі прымушаны былі пакінуць горад Барысаў, які ў бясьсільнай злобе разгрэмілі з гранат ва ўпор праз раку Бярэзіну; шмат загінула мірнага насельніцтва мужчын і жанчын, старых і дзяцей ад уцякаўшых белапалякаў.

Нарэшце, пад рашучым націскам Чырвонай арміі белапалякі прымушаны былі пакінуць Беларусь. Окупанты пачалі шпаркую падрыхтоўку св йго адступленьня, вывозячы з Беларусі машыны, каштоўнасьці, дзяржаўную і прыватную маёмасьць, палячы на сваім шляху вёскі, мястэчкі і гарады. Асабліва па зьверску былі зруйнаваны Барысаў, Полацак. Асабліва ганебным быў падпал гор. Слуцку па загаду генэрала Шаптыцкага—„асьвятліць дарогу маім адступаючым абозам".

Чырвоная армія, разам з чырвонымі партызанамі магутным ударам адкінула ворага, 11 ліпеня аслабаніла Менск і пайшла да сьцен Варшавы. Вызваленьне Менску і Савецкай Беларусі было для працоўных мас вялікім сьвятам. Усюды сустракалі сваю родную Чырвоную армію чырвонымі сьцягамі і грамадзкім любоўным абкружэньнем. З восені 1920 г. быў падпісаны прэлімінарны мір з белапалякамі, а 18-га сакавіка 1921 г. так-званы „Рыскі мірны дагавор."

Вызваленая Беларусь прыступіла зноў да работы па соцыялістычнаму будаўніцтву. Спадчына, пакінутая акупантамі, была надзвычайна цяжкая. Зруйнаваныя фабрыкі і заводы, спаленыя гарады, зруйнаваныя дарожныя шляхі, загнаныя і зьнішчаныя дзесяткі тысячы галоў жывёлы—усюды руіны, папелішчы. Перш-за-ўсё трэба было заставіць задыміць фабрычныя трубы.

Упартай працай рабочых і працоўных мас Беларусі, пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі мы здолелі аднавіць гаспадарку, перавесьці яе далёка за даваенны ўзровень. На сёньнешні дзень мы маем дзесяткі новых фабрык і заводаў з тысячамі рабочых, якія пасьпяхова ажыцьцяўляюць пяцігодку ў чатыры гады.

На сёньнешні дзень мы маем вялізарныя дасягненьні ў галіне сельскае гаспадаркі і асабліва дасягненьні ў галіне колектывізацыі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак і на гэтай глебе іх, ліквідацыю кулацтва як клясы. Звыш 40 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак на сёньнешні дзень знаходзяцца ў колгасах. У краіне, дзе не было ніводнай вышэйшай навуковай установы, зараз маюцца іх дзесяткі. У краіне, дзе было 70 проц. няпісьменнага насельніцтва, зараз уведзена ўсеагульнае абавязковае навучаньне, заканчваецца ліквідацыя няпісьменнасьці сярод дарослага насельніцтва. У краіне, дзе панавала нацыянальная варожасьць, траўля, яўрэйскія пагромы, нацыянальнае бяспраў'е, зараз, на падставе ажыцьцяўленьня ленінскай нацполітыкі мы маем братэрства працоўных усіх нацыянальнасьцяй. Мы маем школы на мовах усіх нацыянальнасьцяй, насяляючых Беларусь, дзеці ў якіх вучацца на сваёй роднай, матчынай мове. Саветы як агульныя, гэтак і нацыянальныя абслугоўваюць насельніцтва на іх роднай мове.

Нашы посьпехі ў замацаваньні дыктатуры пролетарыяту на Беларусі, у галіне індустрыялізацыі і колектывізацыі, у галіне разьвіцця культуры, нацыянальнай па форме і соцыялістычнай па зьместу, ня гледзячы на белапольскі бандытызм у свой час, ня гледзячы на супраціўленьне клясавага ворагу, ня гледзячы на шкодніцтва буржуазных спэцыялістых, ня гледзячы на нацыянал-дэмократычны загавор, маюцца дзякуючы таму, што мы ўваходзім у Саюз Савецкіх Соцыялістычных Рэспублік, што мы атрымліваем вялізарную дапамогу ва ўсіх галінах соцыялістычнага будаўніцтва ад ураду Саюзу ССР, дзякуючы правідловаму вырашэньню нацыянальнага пытаньня, дзякуючы геніяльнаму кіраўніцтву ленінскага ЦК УсеКП(б)Б.

Нашы далейшыя задачы—з рэволюцыйным творчым энтузіязмам ісьці па шляху будаўніцтва соцыялізму, ажыцьцяўляць пяцігодку ў чатыры гады, перамагаючы ў гэтым усе цяжкасьці. Нам трэба, пры варожым нас абкружэньні, яшчэ больш узмацняць абароназдольнасьць нашай краіны, удзесяцярыць нашы клопаты аб становішчы і магутнасьці нашай слаўнай Чырвонай арміі.

Звыш паловы прамысловых рабочых Польшчы—беспрацоўныя

15 ТЫСЯЧ АФІЦЭРАЎ І ЧЫНОЎНІКАЎ УКОМПЛЕКТАВАЛІ „КУЛАЦКІЯ ГНЁЗДЫ“ НА ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ І ЗАХ. УКРАІНЕ

Крывавы тэрор выкарыстоўваецца для падрыхтоўкі антысавецкай вайны

Нарастаньне прадпасылак рэволюцыйнага крызісу

Гаспадарчы развал у фашысцкай Польшчы ў выніку абвастрэньня да крайнасьці экономічнага крызісу, з кожным днём узмацняецца.

На тэрыторыі Польшчы зараз бяздзейнічаюць звыш 1500 фабрык і заводаў.

У Лодзі зачыніўся буйны металяапрацоўчы завод Іона, тэкстыльныя прадпрыемствы Шаполера, Громана, Віджэўскай мануфактуры, скараціла да мінімуму работу ільняная фабрыка ў Жырардаве—такіх прыкладаў можна налічыць надзвычайна шмат. Крызіс б'е ў першую чаргу па становішчы рабочае клясы. Зараз звыш паловы прамысловых рабочых Польшчы знаходзяцца ў становішчы беспрацоўных.

Аграрны крызіс, які пераплятаецца з прамысловым з вялізарнейшай сілай б'е і так па нецярпімаму становішчу Польшчы.

Абшарнікі ўладаюць 15983 буйнымі гаспадаркамі, звыш 50 га кожная, а ўсяго 8.263.616 га. У абшарнікаў эксплёатуецца звыш 800 тысяч сельгасрабочых, ды прыблізна такая-ж колькасьць занята ў кулакоў. Калі сюды яшчэ дабавіць 200 тысяч рабочых падзёншчыкаў, дык армія, з якой смактаюць кроў польская, беларуская і украінская буржуазія, абшарнікі і кулакі досыць солідная,

Цяжар экономічнага крызісу буржуазія імкнецца пераклasьці на плечы рабочых і разбураючайся сялянства. У дадатак да беспрацоў'я сярод прамысловых рабочых, расьце беспрацоў'е ў вёсцы. Усё больш і больш пагаршаецца і без таго цяжкое становішча сельгасрабочых. Абшарнікі ўразаюць і так нізкую для існаваньня заработную плату, асабліва грашовую частку, напрыклад, калі грашовая частка заработнай платы сельгаслесрабочых у даваенны час складала 20 проц., дык зараз складае 8 проц. Нецярпімае становішча сельгасрабочых прымае яшчэ больш жудасны выгляд асабліва там, дзе захоўваюцца перажыткі прыгону, а яны больш за-усё маюць месца на Заходняй Беларусі і Украіне. Так, у Малапольшчы і да гэтага часу дзейнічае статут 1855 году, па якому абшарнік можа колькі хоча катаваць батрака абы „не парэзаць яму скуры і не параніць цела“.

Беспрацоў'е сярод сельгасрабочых яшчэ павялічваецца і тым, што частка гарадзкіх беспрацоўных, згубіўшы ўсялякія пэрспэктывы на працу імкнецца шукаць сабе магчымасьці больш лягчэйшага пражыцьця ў вёсцы.

Буржуазія, з мэтай перашкодзіць клясавай барацьбе на вёсцы імкнецца насаджаць там кулацкія гнёзды, асабліва гэта мае месца на Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне, дзе соцыяльнае прыгнечаньне з асаблівай сілай пераплятаецца з нацыянальным. Тут фашысцкім урадам насаджана 15 тысяч колёнізатарскіх гаспадарак афіцэраў, унтэр-афіцэраў і чыноўнікаў. Наогул надзейных для дзяржавы людзей.

У прадсьмяротных сударгах, польскі фашызм ня толькі не перастае, але-ж наадварот узмоцнена выконвае сваю задачу падрыхтоўкі вайны супроць СССР. Каштарыс вайсковага міністэрства, так як і вайсковая прамысловасьць не падпарадкоўваецца жорскаму разбурэньню ад крызісу. Замежныя крэдыты, галоўным чынам, французскія (хоць сусьветны крызіс і зьнішчае на іх надзею) ідуць на вайсковую падрыхтоўку польскага фашызму, а падрыхтоўка вайны супроць СССР знаходзіцца ў цэнтры ўсёй замежнай політыкі польскага фашызму. На гэтым працуе ўся дзяржаўная машына, гэтаму падпарадкоўваецца экономічная політыка польскага фашызму, гэтаму служыць высяленьне „небясьпечных элемэнтаў“ з Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. Нарэшце, для гэтага фашызм узмацняе крывавы тэрор супроць рэволюцыйнага руху.

Турмы ператвараюцца ў фабрыкі трупаў, у засьценкі іх закінуты тысячы ахвяр фашысцкага тэрору.

Фашысцкі друк узмацняе антысавецкую кампанію, на службе гэтага ППС, нацыянал-фашыстыя—Луцкевіч, Астроўскія і Ко, нават і Троцкі знайшоў патрэбным услужыць польскаму фашызму і прыняў удзел у фашысцкім друку.

Гэта антысавецкая кампанія даходзіць да такіх пахабнейшых выступленьняў, як напрыклад, рэдактара газэты „Слова“ Мацкевіча, які заклікае да бомбавых замахаў супроць прадстаўнікоў савецкага ураду і буйных дзеячоў савецкай рэспублікі.

Зусім зразумела, што ўсім гэтым фашызм падрубае сук, на якім ён сам сядзіць. За апошні час, у дадатак да ўсяго гэтага, мы наглядаем узмоцненьне бражэньня сярод дзяржаўных служачых. Польскі ўрад паказаў сябе няздольным утрымацца на экономічным наступе толькі на рабочую клясу і сялянства і зрабіў наступальны крок і на экономічнае становішча дзяржаўных служачых. 70 тысяч дзяржаўных служачых звальняюцца з устаноў, а ў тых, якія застаюцца, скарачаецца заробчая плата. Гэты вымушаны крок польскага фашызму гаворыць аб сур'ёзнасьці склаўшагася становішча, ён дзейнічае на развал фашысцкага апарату.

Нарастаньне прадпасылак рэволюцыйнага крызісу ў Польшчы ў наяўнасьці. Гэта выяўляецца ў магутным росьце рэволюцыйнага руху пад кіраўніцтвам комуністычнае партыі. На вуліцах гарадоў будуюцца барыкады. У вёсках бойкі сялян з жандарамі. Працоўная маса Польшчы пад кіраўніцтвам компартыі цьвёрда становіцца на шлях рэволюцыйнай барацьбы, а ў гэтым толькі і заключаецца выхад з таго нявыноснага становішча, у якім яны знаходзяцца.

Абвестка

12-га ліпеня, а 6-й гадзіне ўвечары адбудуцца вайсковыя заняткі ў клюбах тых ячэек і колектываў, якія прымацаваны да клюбаў.

Менгарком ЛКСМБ.

НАРКАМАСЬВЕТЫ І ЦСПСБ У РОЛІ ДАЛАКОПАЎ ТРАМАЎСКАГА РУХУ

Трамаўскі „Штандар“ павінен рэяць на ўсіх „франтох“ пяцігодкі


АБ ТРАМАЎСКІМ РУХУ І ЯГО ДАЛАКОПАХ

ТРАМ народжаны Кастрычнікам. Яго карэньні бяруць пачатак з эпохі грамадзянскай вайны і культурнай рэволюцыі.

ТРАМ працуе на нявычэрпнай энэргіі маладых будаўнікоў соцыялізму. Ён яскравы паказчык творчага ўзросту ўсёй рабочай моладзі.

У ТРАМ'е адзіная мэта—выхоўваць моладзь у баявым, клясавым духу, мобілізоўваць працоўных на актыўны ўдзел у соцыялістычным будаўніцтве. Вось чаму ТРАМ ня можа ня быць сучасным і злабадзённым тэатрам. Ён першы і, бадай, адзіны ўзор самадзейнага мастацтва.

„ТРАМ нават пад кутом погляду развіцьця ўсяго нашага рэволюцыйнага тэатру мае вельмі вялікае значэньне“. „Дзякуючы ТРАМ'у, нават людзі, скэптычна настроеныя ў адносінах да мастацтва, бачаць, што пабудова нашага савецкага



Бектрам. Рабочы момант пастаноўкі „Трывогі“, аб якой зусім ня трывожыць ЦСПСБ і НКА.

мастацтва ёсьць рэч ня толькі неабходная і надзвычайна важная, але і магчымая“ (Луначарскі).

„ТРАМ найбольш значнае дасягненьне рабочай клясы наогул і рабочае моладзі ў прыватнасьці ў галіне мастацтва“ (Бубнаў).

Акторы ТРАМ'у не замыкаюцца ў скарлупу профэсыяналізму. Большасьць з іх у той-жа час—рабочыя на вытворчасьці. Гэта забясьпечвае шпаркі, энэргічны і напорысты водгук на ўсе запатрабаваньні сёньняшняга дня і надае любой пастаноўцы ТРАМ'у патрэбны нам тон і тэмпы.

ТРАМ'у ня прыходзіцца пужацца рэпэртуарнага крызісу. Тэкст іх пастановак — продукт творчасьці трамаўскага колектыву. Ён пішацца выключна для ТРАМ'у і не маркуецца быць пастаўленым па-за ім.

Такое даскаланае зрашчэньне драматургіі з тэатрам, арганічнае ўвасабленьне драматурга ў актора, а актора ў непасрэднага будаўніка соцыялізму,—нараджае новы тып п'есы, нараджае той новы сваасаблівы тэкставы монтаж, які ТРАМ называе „дыялектычным прадстаўленьнем“.

У сваёй творчай рабоце ТРАМ выкарыстоўвае ўсе віды вызваленчага і гукавога мастацтва.

Ідучы ў авангардзе самадзейнага мастацтва, трамаўскі рух аказвае вялізарнае, рашаючае значэньне на перабудову нашага старога профэсыянальнага тэатру.

Зараз па СССР налічваецца да 130 ТРАМ'аў. Яны ахапліваюць 7-мі тысячны мастацка-творчы атрад комсамольцаў-ударнікаў мастацтва перадавых барацьбітоў на фронце соцыялістычнага будаўніцтва.

З 130 ТРАМ'аў, каля 20 нацыянальных. Сярод іх: украінскія, татарскія, яўрэйскія, цюрскія, башкірскія і шмат іншых.

Усе яны ў сваіх вобласьцях, рэспубліках—пачынальная творчая сіла. Усе яны даюць узоры пролетарскага самадзейнага мастацтва; усе яны па-бальшавіцку змагаюцца за нацыянальную па форме, пролетарскую па зьместу культуру; усе яны маюць пад сабой цьвёрдую матар'яльную базу.

Створаны і працуюць пад кіраўніцтвам комсамолу ТРАМ'ы і ў Беларусі. Вядучыя з іх ужо зрабілі не малы ўклад у скарбніцу пролетарскага мастацтва.

Ня так даўно мы мелі магчымасьць бачыць пастаноўку беларускага ТРАМ'у „Першы Штандар“ і яўрэйскага—„Фронты“. Абедзьве гэтыя рэчы насычаны патрэбным нам зьместам. Яны мобілізуюць гледача. Яны заражаюць працоўную моладзь жаданьнем будаваць яшчэ лепш, яшчэ мацней, высока трымаць „Штандар“ перамог на ўсіх „франтох“ пяцігодкі.

Зараз беларускі ТРАМ рыхтуе сваю другую пастаноўку—„Трывога“. Гэтая п'еса прысьвечана будучай вайне. П'еса завастрае ўвагу комсамольскіх арганізацый і працоўнай моладзі на пытаньнях выхаваньня, на пытаньнях абароны краіны.

Здавалася-б, што падобныя пастаноўкі беларускіх ТРАМ'аў сугучныя нашым дням, мобілізуючы дзейнічаючы на пролетарскага гледача, і сам трамаўскі рух павінен быў прыцягнуць экстраардынарную ўвагу адпаведных арганізацый.

Законным гэта чаканьне зьяўляецца яшчэ і таму, што на фронце мастацтва глыбокія прарывы, жорсткая клясавая барацьба.

Рэпэртуарны рынак старых профэсыянальных беларускіх тэатраў патрэбным нам пастановачным матар'ялам надзвычайна бедзен. У нядалёкім-жа мінулым ён быў надзвычайна багат адкрытым пролетарскім гледачом нацдэмаўскім хламам, затхлы пах якога мы чуем і да гэтага часу.

Існуючае становішча настойліва патрабавала консолідацыі пролетарскіх сіл для разгорнутай барацьбы з права-опортуністычнымі, нацдэмаўскімі ўплывамі на тэатральным фронце. Зараз [illegible], насычанага пролетарскім духам мастацкага байца, які-б, змагаючыся за клясавую чыстату нашага мастацтва, у той-жа час паказваў старым профэсыянальным беларускім тэатрам шляхі перабудовы творчага напрамку,—сапраўды грандыёзнай справе.

І ўсё-ж, як ня дзіўна, ТРАМ'ы, насуперак патрабаваньням пролетарскай грамадзкасьці, ні Наркамасьветы БССР, ні ЦСПСБ ня прызнаны. (Я не гавару аб фармальным, аб фактычным прызнаньні).

Беларускія ТРАМ'ы ня маюць пад сабою ніякай матар'яльнай базы. У іх няма памяшканьня для работы. Ні гледачы на неадпаразовыя спробы комсамолу пасярэдніцтва Наркамасьветы, ЦСПСБ, Гарсавет і ТРАМ'ам, „стене отчуждение“ на ранейшаму моцна.

Падобныя адносіны вышэйпералічаных арганізацый прыводзяць трамаўскі рух да развалу, у корані падрываюць яго творчую работу.

Сьледуючы дзяйсьвенчым законам, мы гэтую сыстэму прыводзім і адносін к трамаўскаму руху, вядучаму вельмі нашага пролетарскага самадзейнага мастацтва, перадаём на шляхі на палітычную мову.

Атрымліваецца: опортуністычная адносіна трамаўскага руху; з боку НКА, ЦСПСБ, Гарсавету аб'ектыўнае падтрымліваньне нацдэмаўскіх уплываў; аб'ектыўная далакопа клясава-ворожым сілам на фронце мастацтва.

Іншай думкі, іншай кваліфікацыі гэтай справе быць ня можа.

Мы просім ЦК партыі і Саўнаркам БССР у самы бліжэйшы час разгледзець гэтае пытаньне.

Трамаўскі рух напярэдадні развалу.

Далакопы яго: Наркамасьветы, ЦСПСБ і Гарсавет.

Міх. ПЛАТАЎ.

РАБОЧАЯ МОЛАДЗЬ ПАТРАБУЕ

Бяздушныя, опортуністычныя адносіны Менгарсавету, НКА і ЦСПСБ, душаць дзяцішча беларускага комсамолу—БелТРАМ. Кіпучая, плённая творчая праца БелТРАМ'а спынілася. Гарсавет, НКА, ЦСПСБ кормяць ТРАМ пастановамі ды абяцанкамі, а ніводная з пастаноў ня выконваецца.

Трамаўскі рух нарадзіўся ў рабочай гушчы. Ён ахапіў усю Савецкую Беларусь.

Опортуністычнае маўчаньне на сыгналы друку (у „Чырвонай Зьмене“ № 152) на ліст „варашылаўцаў“ да Гарсавету, НКА і ЦСПСБ з боку гэтых устаноў недапушчальна. Комсамол і працоўная моладзь чыгункі далучаюцца да патрабаваньняў „варашылаўцаў“ і патрабуюць: Гарсавет, НКА, ЦСПСБ павінны забясьпечыць БелТРАМ памяшканьнем. Гэтыя ўстановы павінны стварыць умовы для плённай і карыснай работы БелТРАМ'у.

Не дамо опортуністым сушыць плённую працу дзяцішча комсамолу Савецкай Беларусі—БелТРАМ'у.

Актыў заводу „Полымя Рэволюцыі“ 42 подпісы.

* * *

ЦК ЛКСМБ і „Чырвоная Зьмена“ некалькі разоў ставілі пытаньне перад адпаведнымі арганізацыямі аб тым, што БелТРАМ знаходзіцца пад пагрозай развалу.

Ня гледзячы на рашучыя патрабаваньні, гэтыя ўстановы і цяпер нічога ня робяць, каб [illegible] БелТРАМ'у.

„Усе справа ў бухгалтэрыі“—адказалі брыгадзе „ЧЗ“ опортуністы з ЦСПСБ.

Сакратар Менгарсавету тав. Шаўкавец таксама пачаў агітаваць—„ТРАМ гэта справа патрэбная, але ў нас разгорнутае будаўніцтва, мы ня можам яго скарачаць, таму няма адкуль узяць грошы на ТРАМ“.

„Грошай няма“, „мы нічога ня можам зрабіць“—амаль у адзін голас адказваюць і Менгарсавет і ЦСПСБ і Наркамасьветы. Ніводзін з прадстаўнікоў гэтых установаў ня прыйшоў у „Чырвоную Зьмену“ на нараду аб ТРАМ'е ня чытаў. Зварот „Варашылаўцаў“ таксама ня бачыў.

Брыгада „Чырвонай Зьмены“
Палянскі Я., Куцянаў С.

Адказны рэдактар **МІХ. ПЛАТАЎ.**

Друкарня імя таз. Сталіна.

Галоўлітбел № 599.